ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СУБОТА, 17 ВЕРАСНЯ 1938 г. № 51 (393)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЗА АВАЛОДАННЕ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ТЭОРЫЯЙ!

Уся наша партыя, усе бальшэвікі, партыйныя і непартыйныя, з неаслабнаю цікавасцю і велізарнай увагаю сочаць за публікуемым ў «Праўдзе» Кароткім курсам гісторыі ВКП(б), адобраным ЦК ВКП(б). Гэтая кніга — раздзел за раздзелам — раскрывае перад усім светам вопыт вялікай барацьбы і галоўных перамог партыі Леніна — Сталіна. Гэтая кніга вучыць настойлівасці і рашучасці ў рэвалюцыйнай барацьбе, яна вучыць марксізму-ленінізму, гэтаму ўсеперамагаючаму вучэнню пролетарыята.

У трэцім раздзеле Кароткага курса гісторыі ВКП(б), надрукаваным ва ўчарашнім нумары «Праўды», цэнтральнае месца прысвечана ленінскаму вучэнню аб **тактыцы** пролетарыята ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, тэорыі і тактыцы соцыялістычнай рэвалюцыі. Ленін у сваёй выдатнай працы «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», разграміўшы procнабуржуазную тактычную ўстаноўку меншавікоў, узброіў рабочы клас Расіі на далейшую барацьбу з царызмам, даў ясную перспектыву неабходнасці перарастання буржуазнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю соцыялістычную. Як сказана ў Кароткім курсе гісторыі ВКП(б), Ленін «узбагаціў марксізм новай тэорыяй рэвалюцыі і заклаў асновы той рэвалюцыйнай тактыкі бальшэвіцкай партыі, пры дапамозе якой пролетарыят нашай краіны атрымаў у 1917 годзе перамогу над капіталізмам».

Публікуемы сёння чацверты раздзел Кароткага курса гісторыі ВКП(б) у значнай сваёй частцы прысвечан агульным пытанням марксісцка-ленінскай **тэорыі**.

Ленін, будуючы перадавую марксісцкую партыю, партыю соцыяльнай рэвалюцыі, партыю дыктатуры пролетарыята, закладваючы яе арганізацыйныя асновы, разам з тым каваў яе ідэйна-тэарэтычную магутнасць. Стваралася партыя, здольная павесці рабочы клас на смяротэльную схватку з капіталізмам. Гэта патрабавала старраннай падрыхтоўкі арганізацыйных, палітычных і тэарэтычных пытанняў, бо гутарка ішла аб стварэнні партыі, здольнай узначаліць соцыялістычную рэвалюцыю.

«Уся гісторыя барацьбы з «эканамістамі», меншавікамі, трацкістамі, адзавістамі, ідэалістамі ўсіх масцей аж да эмпірыя-крытыкаў, — была гісторыяй падрыхтоўкі такой іменна партыі. Бальшэвікі хацелі стварыць новую, **бальшэвіцкую** партыю, здольную быць узорам для ўсіх, хто хацеў мець сапраўдную рэвалюцыйную марксісцкую партыю. Бальшэвікі рыхтавалі такую партыю ўжо з часоў старой «Искры». Яны рыхтавалі яе ўпорна, настойліва, не гледзячы ні на што. Асноўную і рашаючую ролю адыгралі ў гэтай падрыхтоўчай рабоце такія працы Леніна, як «Што рабіць?», «Дзве тактыкі» і т. д. Кніга Леніна «Што рабіць?» была **ідэалагічнай** падрыхтоўкай такой партыі. Кніга Леніна «Крок наперад, два крокі назад» была **арганізацыйнай** падрыхтоўкай такой партыі. Кніга Леніна «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі» была **палітычнай** падрыхтоўкай такой партыі. Нарэшце, кніга Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» была **тэарэтычнай** падрыхтоўкай такой партыі.

Можна з упэўненасцю сказаць, што ніколі яшчэ ў гісторыі ні адна палітычная група не была так грунтоўна падрыхтована да таго, каб аформіцца ў партыю, як бальшэвіцкая група». (Кароткі курс гісторыі ВКП(б).

Чацверты раздзел Кароткага курса гісторыі ВКП(б), аналізуючы філасофскія працы Леніна, яго выдатную, неперавзыйдзеную працу «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», паказвае барацьбу Леніна, барацьбу бальшэвіцкай партыі супроць філасофска-тэарэтычнага рэвізіянізма, у абарону тэарэтычных асноў марксізма — дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма. Бальшэвіцкая партыя вырасла і загартавалася ў жорсткай барацьбе супроць усіх і ўсялякіх апартуністаў на практыцы і ў тэорыі, яна выкавала свой адзіны навуковы светапогляд, апракідваючы і громячы ідэалізм, папоўшчыну, усё тое, што цягнула пролетарыят назад. Перад усім чалавецтвам наша партыя прадстае, як носьбіт самай перадавой тэорыі, як нястомны абаронца сапраўднай навукі і прагрэса.

Зусім выключнае значэнне набывае асвятленне пытанняў дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, дадзенае ў чацвертым раздзеле. З гранічнай яснасцю, на высокім навуковым ўзроўні, тут пададзены тэарэтычныя асновы марксісцкай партыі. Чаму гэтым пытанням удзелена такое вялікае месца? Таму, сказана ў Кароткім курсе гісторыі ВКП(б), «што дыялектычны і гістарычны матэрыялізм складаюць тэарэтычны фундамент комунізма, тэарэтычныя асновы марксісцкай партыі, а веданне гэтых асноў і, значыць, іх засваенне з'яўляецца абавязкам кожнага актыўнага дзеяча нашай партыі».

Чацверты раздзел з велізарнай сілай пераканальнасці паказвае ўнутраную неразрыўную сувязь агульна-філасофскіх асноў марксізма — дыялектычнага матэрыялізма з тэорыяй пролетарскай рэвалюцыі, сувязь агульных тэарэтычных пытанняў з практычнымі палітычнымі пытаннямі барацьбы рабочага класа. Дзякуючы выключна чоткаму і глыбокаму асвятленню філасофскіх пытанняў, дадзенаму ў Кароткім курсе гісторыі ВКП(б), наш партыйны актыў здолее авалодаць усім тэарэтычным багаццем марксізма-ленінізма. Работнікі філасофскага фронта павінны вучыцца глыбокай распрацоўцы, яснаму і папулярнаму выкладу асноў філасофіі. Ліквідацыя тэарэтычнай адсталасці партыйных кадраў немысліма без засваення і глыбокага ведання законаў грамадскага развіцця. Наша партыя, створаная Леніным і Сталіным, заўсёды надавала велізарнае значэнне рэвалюцыйнай тэорыі. «Без рэвалюцыйнай тэорыі, — пісаў Ленін, — не можа быць і рэвалюцыйнага руху... **Ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй».**

«Тэорыя, калі яна з'яўляецца сапраўды тэорыяй, дае практыкам сілу арыентыроўкі, яснасць перспектывы, упэўненасць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы». (Сталін).

Ленін і Сталін адстаялі марксісцкую тэорыю ад апашлення і скажэння яе ворагамі, безупынна развівалі гэтую тэорыю, паглыблялі, узбагачалі яе вопытам рэвалюцыйнай барацьбы. Сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма з'яўляюцца бліскучым прыкладам злучэння рэвалюцыйнай практыкі з рэвалюцыйнай тэорыяй. Бальшэвіцкі дзеяч, узброены навуковай тэорыяй, заўсёды мае перад сабой шырокую перспектыву, ён разумее сувязь з'яў, сувязь падзей, ён умее злучаць кожны свой практычны крок з канчатковай мэтай нашай барацьбы. Наадварот, палітычны дзеяч, не ўзброены перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй, рыскуе страціць перспектыву, збіцца з правільнага шляху, рыскуе стаць ахвярай варожага ўплыву, угразнуць у балоце дзялянцтва і апартунізма. Не раз і не два ворагі прарочылі пагібель бальшэвікам. Але наша партыя ўпэўнена вяла рабочы клас, усіх працоўных ад перамогі да перамогі. Гэтая ўпэўненасць грунтавалася на глыбокім веданні законаў грамадскага развіцця, на веданні законаў соцыялістычнай рэвалюцыі, на веданні прыроды класаў. Без гэтых ведаў перамога над капіталізмам была-б немагчыма.

«Сіла і жыццёвасць марксізма-ленінізма заключаецца ў тым, што ён апіраецца на перадавую тэорыю, якая правільна адлюстроўвае патрэбнасці развіцця матэрыяльнага жыцця грамадства, падымае тэорыю на належную ёй вышыню і лічыць сваім абавязкам выкарыстаць да дна яе мабілізуючую, арганізуючую і пераўтвараючую сілу». (Кароткі курс гісторыі ВКП(б).

Марксізм-ленінізм — гэта не догма, а кіраўніцтва да дзеяння. Марксізм-ленінізм — гэта жывая рэвалюцыйная тэорыя, якая складваецца ў неразрыўнай сувязі з рэвалюцыйнай практыкай. Авалоданне марксізмам-ленінізмам не павінна ператварыцца ў зазубрыванне асобных формул, цытат. Трэба імкнуцца зразумець сутнасць, душу марксісцкага вучэння, браць тэарэтычныя палажэнні марксізма-ленінізма ў цеснай сувязі з практыкай, сувязі з канкрэтнай абстаноўкай. Марксізм-ленінізм, будучы жывым рэвалюцыйным вучэннем, пастаянна развіваецца і ўзбагачаецца вопытам рэвалюцыйнай барацьбы.

Наша партыя, партыя бальшэвікоў, прадстаўляе найвялікшую неперамажную сілу. Магутнасць і сіла яе яшчэ больш узрастуць, калі ўсе члены партыі будуць няўхільна працаваць над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню, будуць авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй.

За апошні час на кіруючую работу вылучаны дзесяткі тысяч новых людзей, многія з якіх уладаюць вялікім практычным вопытам. Але аднаго толькі практычнага вопыту яшчэ недастаткова, каб быць сапраўдным бальшэвіцкім дзеячом. Таму трэба авалодваць рэвалюцыйнай тэорыяй, сістэматычна і ўпорна працаваць, пасцігаючы марксізм-ленінізм. Авалоданне перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй дапаможа нам хутчэй распазнаваць ворагаў, зрываць з іх усе і ўсякія маскі, выкарчоўваць і знішчаць здраднікаў соцыялістычнай радзімы. Авалоданне рэвалюцыйнай тэорыяй забяспечыць нам пераможны рух наперад, да комунізма!

(«ПРАВДА»).

12 верасня 1938 г.

Я. КОЛАС

БАЕЦ ЧЫРВОНЫ

Шлях мой слаўны і шырокі.
Выпаў гонар мне высокі:
Я — баец чырвоны.
Я не знаю большай чэсці,
Як святы доўг чэсна несці —
Стаць на абарону.

Вартаваць свой край, граніцы,
Як вачэй сваіх зяніцы,
Як наш скарб бясцэнны.
Бо я знаю — землі нашы,
Горы, моры, нівы, пашы
Для ўсіх нас свяшчэнны.

За іх кроў бацькоў праліта.
Праз гарніла мук здабыта
Наша доля, воля.
Бо на гэтых землях, нівах
Мой народ жыве шчасліва,
Як не жыў ніколі.

І я, радасны, вясёлы,
Іду ў армію — у школу
Сталінскае складкі.
Я ўсяму народу, краю
Урачыста абяцаю:
Для радзімы-маткі

Сіл сваіх не пашкадую,
Волю ўзброю маладую
На пачэснай варце.
Каб сам маршал Варашылаў
Мне сказаў з усмешкай мілай:
«Малайчына, браце».

5/IX 1938 г.



Мастакі да XX годдзя Ленінска-Сталінскага комсамола. НА ЗДЫМКУ: карціна мастака Драздова «Прыбыццё ў флот першага комсамольскага папаўнення ў 1922 годзе».

Рэпрадукцыя Н. Янова (СФ).

Х. Мальцінскі

ПРЫЗЫЎНАЯ ПЕСНЯ

Вітай мяне, вітай, сястра,
Я сёння самы шчасны —
На прызыве сказалі мне:
— У якую хочаш часць ты?

Праверыўшы старанна слых,
І мускулы, і вочы,
Мне доктар ветліва кіўнуў:
— Як дуб, ты моцны, хлопча!

Вось дачакаўся я ў жыцці
Хвіліны урачыстай:
Ці кулямётчыкам мне быць,
Ці быць артылерыстам?

І я сказаў: — У флоце быць —
Мая старая мара,
І зайздрасць у таварышоў
З'явілася на тварах.

Вітай мяне, вітай, сястра,
Бо я марак чырвоны,
Я буду ўпэўнена стаяць
На варце абароны.

А ты, сястра, бяжы хутчэй,
Бяжы хутчэй да таты,
Скажы, што сын яго цяпер
У Чырвоны флот прыняты.

А потым, любая сястра,
Схадзі яшчэ да маці,
Скажы, што будзе сын яе
Матросам на «Мараце».

А сам я хутка пабягу,
Скажу маёй каханай.
Вунь побач дом яе стаіць,
Вунь побач, дзе каштаны.

Вось я ўвайшоў. Яна глядзіць
Мне ў твар з усмешкай светлай.
Скажы, кім будзеш? Не марудзь, —
Пытаецца так ветла.

І весткай радаснай яна
Захоплена і ўзнята.
Яе жаніх у флот ідзе —
Вось гэта будзе свята.

Пераклаў з яўрэйскай мовы
Ал. ЗАРЫЦКІ.

А. Бялевіч

НАД АМУРАМ

Над Амурам, па-над сінім
Нам расстацца прышоў час.
Дык бывай-жа, друг любімы,
Не забудзь-жа мой наказ.

Перадай маёй каханай
Вестку цяжкую маю,
Што на фронце, на світанні
Цяжка ранены ў баю.

І яшчэ скажы станіцы,
Стэпу, Дону перадай,
Што ўміраю на граніцы,
За любімы родны край.

...Ён паводдзя к долу кінуў,
Сам схіліўся ля мяжы,
Прашаптаў ледзь: «Конь любімы,
Майму другу паслужы».

...Над ракою ў небе сінім
Загаралася зара:
Ехаў коннік праз даліну
На кані свайго сябра.

Да XX гадавіны ленінска-сталінскага комсамола

НОВЫЯ КНІГІ

Белдзяржвыдавецтва выпускае да XX гадавіны ленінска-сталінскага комсамола рад новых кніг. Сярод іх — зборнік «Ленін і Сталін аб моладзі», «Ленін аб задачах саюза моладзі» (прамова на III Усерасійскім з'ездзе РКСМ), зборнікі — «Мы жывем на граніцы», «Шчаслівым совецкім дзецям», зборнік работ маладых навуковых работнікаў навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці БССР і рад арыгінальных і перакладных мастацкіх твораў. У ліку арыгінальных— «Выбраныя апавяданні» М. Лынькова, паэма «Мы жывем на граніцы» А. Куляшова, «Маленькі разведчык» Глазырына, паэма «Пра майго таварыша» Жаўрука і Ушакова, «Юмар» Крапівы, паэма «Косця чэкіст» М. Калачынскага і інш. У ліку перакладных — Беланжэ «Мне дваццаць год», Гюго «Гаўрош», Катаева «Я сын працоўнага народа», Голубевай «Хлопчык з Уржума», Героя Совецкага Саюза Галавіна «Як я стаў палярным лётчыкам», Макарэнка «Педагагічная паэма» і іншыя.

ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА—ДА ЮБІЛЕЮ КОМСАМОЛА

Тэатр Юнага гледача БССР рыхтуе да дваццатай гадавіны ленінска-сталінскага комсамола антыфашысцкую п'есу маладога драматурга Раймонд Шабаленкі «Годы выпрабавання», якая малюе ўдзел нямецкага комсамола ў барацьбе з фашызмам.

Дзея адбываецца ў Германіі ў нашы дні.

Рэпетыцыі п'есы — у поўным разгары. Музыку да п'есы піша малады кампазітар Лукас. Мастацкае афармленне — мастака Мільчына, пастаноўка заслужанага артыста БССР Міровіча і рэжысёра-комсамольца Палічыэцкага.

Першы спектакль п'есы «Годы выпрабавання» адбудзецца 29 кастрычніка бягучага года.

З іншых мерапрыемстваў па юбілею комсамола калектыў Тэатра Юнага гледача вызначыў арганізацыю выстаўкі «Комсамол у СССР і за мяжой», аказанне метадычнай дапамогі школьнай самадзейнасці, арганізацыю шэфскіх спектакляў для Чырвонай Арміі.

МАЛАДЫЯ ПАТРЫЁТЫ МАЦЕРЫ-РАДЗІМЫ

Аднагодкі Вялікага Кастрычніка, маладыя сыны нашай мацеры-радзімы, становяцца пад баявыя, авеяныя легендарнай славай, сцягі гераічнай Чырвонай Арміі і магутнага Ваенна-Марскога Флота, каб выканаць свой ганаровы абавязак перад соцыялістычнай радзімай.

Праходзіць чарговы прызыў. Совецкі народ шле сваіх лепшых сыноў на пачэсную службу—стаць са зброяй у руках на варце шчаслівага жыцця, квітнення нашай зямлі, вялікіх заваёў соцыялізма.

Здзейсніліся мары соцень, тысяч юнакоў—рабочых і калгаснікаў, служачых і інтэлігенцыі,—яны ідуць на прызыўныя пункты. Прызыўныя пункты—гэта святочна прыбраныя клубы. Музыка і весялосць не змаўкаюць тут з ранку да надвячорка. У прыўзнята святочным настроі прыходзіць моладзь з адзінаю, хвалююча-радаснай думкай: стаць у рады Чырвонай Арміі.

Чырвоная Армія! Ваенна-Марскі Флот! Гэта—ажыццяўленне самых жаданых думак. Чырвоная Армія—цудоўная школа, якая не толькі вучыць байца выдатна валодаць зброяй, але ўзбагачае ведамі і культурай, загартоўвае фізічна, выхоўвае мужнасць, адвагу і палкую нянавісць да ворагаў народа. Быць байцом Чырвонай Арміі—значыць: быць бязмежна адданым справе Леніна—Сталіна, справе соцыялізма, быць бясстрашным, гатовым у кожную мінуту аддаць за маці-радзіму жыццё.

Стаць гордым сокалам-лётчыкам, адважным танкістам, выдатным коннікам,—мужным байцом Чырвонай Арміі—марыць наша моладзь. І да прызыву, без адрыву ад вытворчасці, тысячы маладых патрыётаў радзімы авалодалі лётнай справай, парашутызмам, вывучылі матор, сталі добрымі кулямётчыкамі, слаўнымі коннікамі, варашылаўскімі стралкамі. Пісьменная, фізічна здаровая, падрыхтаваная моладзь папаўняе рады Чырвонай Арміі.

Чырвоная Армія, выхаваная і загартаваная вялікім Сталіным, бальшэвіцкай партыяй, на чале з выдатнейшым палкаводцам, першым маршалам Совецкага Саюза Клімэнтам Ефрэмавічам Варашылавым, з'яўляецца лепшай і магутнейшай арміяй у свеце, здольнай разграміць усякага ворага, які пасмее ступіць на свяшчэнную совецкую зямлю.

У гэтым пераканаліся і ворагі. Калі фашысцкія падпальшчыкі вайны на Далёкім Усходзе зрабілі спробу ў раёне возера Хасан уварвацца на нашу зямлю, яны былі змецены сакрушальным ударам.

З баявым дэвізам: «За таварыша Сталіна! За маці-радзіму!»—з імем правадыра на вуснах ішлі нашы байцы ў бой. І фашысцкія падпальшчыкі вайны—самурайскія банды моцна адчулі грозную сілу нашай зброі і гераізм байцоў—мужных сыноў нашай радзімы, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна.

І калі заўтра вайна... З імем Сталіна ўвесь совецкі народ у адзіным парыве стане на абарону роднай зямлі.

У дні, калі фашысцкая Германія рыхтуе ўдар на незалежнасці Чэхаславацкага народа, распальвае крывавы пажар сусветнай вайны на Захадзе, а Японія топіць у крыві кітайскі народ,—на Усходзе, у дні, калі няспынна нарастае пагроза фашысцкага нападу на нашу радзіму,—прызываецца шчаслівае пакаленне сталінскай моладзі.

Прызыўнікі, атрымаўшыя высокае імя воіна Чырвонай Арміі, павінны аддаць усю энергію, увесь свой юнацкі запал вырашэнню пачэсных задач баявой падрыхтоўкі, далейшага ўмацавання абароннай магутнасці Совецкага Саюза, быць такімі-ж мужнымі, бясстрашнымі байцамі ва шчасце і спакой нашай радзімы, якімі паказалі сябе героі-байцы Далёкаўсходняга Чырвонасцяжнага фронта.

Такі наказ дае сваім сынам-прызыўнікам совецкі народ.

Нязмерна вялікая любоў нашага народа да свайго роднага дзецішча—Чырвонай Арміі, бо «народ і армія складаюць адно цэлае, адну сям'ю» (Сталін). Таму дні прызыву—дні радасці, дні ўрачыстасці ўсяго народа.

Любоў да гераічнай Чырвонай Арміі, да яе арганізатара і кіраўніка—таварыша Сталіна, да вернага сталінца—наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава наш народ выказвае ў сваёй творчасці—у хвалюючых песнях,

Сонца яснае нам свеціць,
Песня разліваецца,—
Мой міленькі, даражэнькі
У армію збіраецца...

З радаснай песняй праводзяць прызыўнікоў. У песнях і бацькоўскі наказ сыну, які ідзе служыць на граніцу:

— Ды глядзі, сынок мой мілы,
Стой там моцна, як нідзе!..

І словамі шчырай песні кажуць прызыўнікі:

Заяўляем, мудры Сталін,
І цябе, наш родны Клім,
Што за слаўную радзіму
Жыццё і сілы аддадзім...

А некалі—у змрочнай мінуўшчыне—бытавалі ў народзе іншыя песні. Гэта былі песні жалобы, невымоўнага гора і горкай тугі, бо прызыў тады—прызыў у царскую армію—быў страшэннай пакутай, горам народа.

Сёнешнія прызыўнікі—наша шчаслівае пакаленне толькі з песень старых ды з кніжак ведае пра катаржную «царскую службу». І здаецца, той час ужо ў далёкай гісторыі.

Але пакуты, здзекі і дзікая муштра—рэальнасць і зараз—за рубяжом, у арміях капіталістычных краін. І працоўная моладзь Германіі, Польшчы, Японіі і іншых краін усяляк імкнецца ўхіліцца ад салдацкай катаргі. Толькі там, дзе народ вядзе барацьбу за сваю незалежнасць супроць фашысцкіх агрэсараў, на фронтах рэспубліканскай Іспаніі, на фронтах Кітая працоўная моладзь сама бярэ зброю, з энтузіязмам ідзе на перадавыя пазіцыі. Барацьба гэтых маладых байцоў, якія паказваюць цуды адвагі—сыноў рэспубліканскай Іспаніі, сыноў вялікага кітайскага народа,—захапляе нашу моладзь.

Маладых прызыўнікоў — сталінскую моладзь песнямі радасці вітае совецкі народ. Пра гэту моладзь, пра слаўных байцоў Чырвонай Арміі павінны быць напісаны нашымі паэтамі і пісьменнікамі хвалюючыя творы. Павінны быць створаны цудоўныя творы мастацтва пра маладых патрыётаў радзімы, выпеставаных партыяй Леніна—Сталіна.

Совецкая краіна кліча пад баявыя сцягі маладых сыноў! І з натхненнем, з'яднаныя адзіным імкненнем—быць вартымі высокага імя воіна Чырвонай Арміі, гатовыя аддаць жыццё за шчасце свайго народа, ідуць на прызыў маладыя патрыёты радзімы, каб у радах Арміі надзейна ахоўваць несакрушальнасць совецкіх граніц, мужна змагацца за справу Леніна — Сталіна, за комунізм.

Прывітанне маладым прызыўнікам—слаўнаму папаўненню Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ ЯК ЛЮСТРА РУСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

(З АРТЫКУЛА В. І. ЛЕНІНА)

Супроцьстаўленне імені вялікага мастака з рэвалюцыяй, якой ён яўна не зразумеў, ад якой ён яўна адхіліўся, можа здацца на першы погляд дзіўным і штучным. Не называць-жа люстрам таго, што відавочна не адлюстроўвае з'явы правільна? Але наша рэвалюцыя — з'ява надзвычай складаная; сярод масы яе непасрэдных тварцоў і ўдзельнікаў ёсць шмат сацыяльных элементаў, якія таксама яўна не разумелі таго, што адбывалася, таксама адхіляліся ад сапраўдных гістарычных задач, якія былі пастаўлены перад імі ходам падзей. І калі перад намі сапраўды вялікі мастак, дык некаторыя хоць-бы з істотных бакоў рэвалюцыі ён павінен быў адлюстраваць у сваіх творах. Легальная руская прэса, перапоўненая артыкуламі, пісьмамі і заметкамі з прычыны юбілею 80-годдзя Талстога, менш за ўсё цікавіцца аналізам яго твораў з пункту гледжання характару рускай рэвалюцыі і рухаючых сіл яе. Уся гэтая прэса да нудоты перапоўнена двудушнасцю, двудушнасцю двоістага роду: казённай і ліберальнай. Першая ёсць грубая двудушнасць прадажных пісак, якім учора было загадана цкаваць Л. Талстога, а сёння — адшукваць у ім патрыятызм і пастарацца захаваць прыстойнасць перад Еўропай. Што пісакам гэтага сорту заплочана за іх пісаніну, гэта ўсім вядома і нікога ашукаць яны не могуць. Куды больш удасканаленае і таму куды больш шкоднае і небяспечнае двудушніцтва ліберальнае. Паслухаць кадэцкіх Балалайкіных з «Речи» — спачуванне іхнае Талстому самае поўнае і самае гарачае. На справе, разлічаная дэкламацыя і напышлівыя фразы, пра «вялікага богашукальніка» — адна суцэльная фальш, бо рускі ліберал ні ў талстоўскага бога не верыць, ні талстоўскай крытыцы існуючага ладу не спачувае. Ён прымазваецца да папулярнага імені, каб прыўмножыць свой палітычны капіталец, каб разыграць ролю правадыра агульнанацыянальнай апазіцыі, ён стараецца громам і траскатнёй фраз **заглушыць** патрэбу простага і яснага адказу на пытанне: чым выклікаюцца крыклівыя супярэчнасці «талстоўшчыны», якія недахопы і слабасці нашай рэвалюцыі яны выказваюць?

Супярэчнасці ў творах, поглядах, вучэннях, у школе Талстога — сапраўды крыклівыя. З аднаго боку геніяльны мастак, які даў не толькі непараўнальныя карціны рускага жыцця, але і першакласныя творы сусветнай літаратуры. З другога боку — памешчык, які юродствуе ва Хрысце. З аднаго боку — надзвычай моцны, непасрэдны і шчыры пратэст супроць грамадскай ілжы і фальшы — з другога боку «талстовец», г. зн. заяцяганы, істэрычны хлюпік, які называецца рускім інтэлігентам, які, публічна б'ючы сябе ў грудзі, гаворыць: «Я брыдкі, я паганы, але я займаюся нраўсцвенным самаўдасканальваннем; я не ем больш мяса і жыўлюся цяпер рысавымі катлетамі». З аднаго боку, няшчадная крытыка капіталістычнай эксплаатацыі, выкрыванне ўрадавых гвалтаў, камедыі суда і дзяржаўнага ўпраўлення, ускрыццё ўсёй глыбіні супярэчнасцей паміж ростам багацця і заваяваннямі цывілізацыі і ростам галечы, здзічэласці і пакут рабочых мас; з другога боку, — юрадзівая прапаведзь «непраціўлення злу» гвалтам. З аднаго боку, самы цвярозы рэалізм, зрыванне ўсіх і ўсялякіх масак; з другога боку — прапаведзь адной з самых гнусных рэчаў, якія толькі ёсць на свеце, іменна: рэлігіі, імкненне паставіць на месца папоў па казённай пасадзе папоў па маральнаму перакананню, г. зн. культываванне самай утончанай і таму асабліва агіднай папоўшчыны. Да праўды:

Ты и убогая, ты и обильная,
Ты и могучая, ты и бессильная,
— Матушка Русь!

Што пры такіх супярэчнасцях Талстой не мог абсалютна зразумець ні рабочага руху і яго ролі ў барацьбе за сацыялізм, ні рускай рэвалюцыі, гэта само сабой відавочна. Але супярэчнасць у поглядах і вучэннях Талстога не выпадковасць, а выражэнне тых супярэчлівых умоў, у якія пастаўлена было рускае жыццё апошняй трэці XIX стагоддзя. Патрыярхальная вёска, якая ўчора толькі вызвалілася ад прыгону, аддана была літаральна на паток і рабаванне капіталу і фіску. Старыя асновы сялянскай гаспадаркі і сялянскага жыцця, асновы, якія сапраўды трымаліся на працягу стагоддзяў, пайшлі на злом з надзвычайнай хуткасцю. І супярэчнасці ў поглядах Талстога трэба ацэньваць не з пункту гледжання сучаснага рабочага руху і сучаснага сацыялізма (такая ацэнка, зразумела, неабходна, але яна недастатковая), а з пункту гледжання таго пратэсту супроць надыходзячага капіталізма, рабавання і абеззямелення мас, які павінен быў быць народжан патрыярхальнай рускай вёскай. Талстой смешны, як прарок, які знайшоў новыя рацэпты выратавання чалавецтва, — і таму зусім мізэрныя замежныя і рускія «талстоўцы», якія пажадалі ператварыць у догму акурат самы слабы бок яго вучэння. Талстой вялікі, як выразнік тых ідэй і тых настрояў, якія склаліся ў мільённаў рускага сялянства да часу надыходу буржуазнай рэвалюцыі ў Расіі. Талстой арыгінальны, бо сукупнасць яго поглядаў, шкодных як цэлае, выказвае акурат асаблівасці нашай рэвалюцыі, як **сялянскай** буржуазнай рэвалюцыі. Супярэчнасць у поглядах Талстога, з гэтага пункту гледжання, — сапраўднае люстра тых супярэчлівых умоў, у якія пастаўлена была гістарычная дзейнасць сялянства ў нашай рэвалюцыі.

(В. І. Ленін «Выбраныя творы», т. VI).

Да юбілею Т. Г. Шэўчэнка

* * *

У 1939 годзе спаўняецца 125 год з дня нараджэння вялікага украінскага кабзара Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка.

Пісьменнікі і паэты Савецкай Беларусі тт. Я. Колас, Я. Купала, К. Крапіва, З. Бядуля, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, М. Клімковіч перакладаюць творы вялікага кабзара на беларускую мову.

Пісьменнік Якуб Колас пераклаў ужо чатыры тысячы радкоў.


Ніжэй мы друкуем вершы «Раскапаная магіла», «Чыгірын» і ўрывак з паэмы «Нявольнік» Т. Г. Шэўчэнка ў перакладзе **Я. Коласа.**

———o———

Т. Г. Шэўчэнка

РАСКАПАНАЯ МАГІЛА

Свеце ціхі, краю мілы,
Мая Украіна.
За што табе спусташэнне,
За што, маці, гінеш.
Ці ты ў ранні на світанні
Бога не маліла,
Ці ты дзетак непаслушных
Праўдзе не вучыла,
Малілася, дух раняла,
Дзень і ноч не спала,
Малых дзетак даглядала,
Праўдзе навучала.
Выраслалі мае кветы,
Мае краскі-дзеці.
Панавала і я колісь
На шырокім свеце...
Панавала. Ой, Багдане,
Неразумны сыну,
Паглядзі цяпер на маці,
На сваю Украіну,
Што калышучы спявала
Пра сваю нядолю,
Што спяваючы рыдала,
Выглядала долю.
Ой, Багдане, Багданочку.
Каб наўперад знала,
У калысцы-б задушыла,
Уночы-б прыспала.
Стэпы мае запраданы
Гандлярам, нямчурам,
Сыны мае на рабоце
За чужацкім мурам.
Днепро, брат мой, высыхае,
Мяне пакідае,
Мае мілыя магілы
Чужак разбірае.
А тым часам пярэкіды
Няхай падрастаюць,
Хай чужынцу дапамогуць
Гаспадараваці,
Ды латаную сарочку
З мацеры знімаці —
Памагайце, нелюдзкі,
Матку катаваці.
На чацвера раскапана,
Разрыта магіла...
Чаго яны там шукалі,
Што там палажылі
Бацькі нашы... Эх, ды каб там,
Каб-жа зайшлі тое, што там
пахавалі,
Не плакалі-б дзеці і маці ад жалю.



Л. Н. ТАЛСТОЙ.

З партрэта мастака І. Н. Крамскога.

* * *

Т. Г. Шэўчэнка

ЧЫГІРЫН

М. С. ШЧЭПКІНУ

Чыгрыне, Чыгрыне,
На свеце ўсё гіне,
І святая твая слава,
Як пылінка ў плыні,
За вятрамі халоднымі
У хмары прападае,
Над зямлёю лятуць леты,
Днепро высыхае,
Рассыпаюцца магілы
Курганы магілы, —
Твая слава. І пра цябе,
Старча маласілы,
Ніхто й слова не прамовіць,
Ніхто й не пакажа,
Дзе ты стаяў. Чаго стаяў, —
І на смех не скажа.

За што-ж мы біліся з панамі
І з тымі дзікімі ордамі?
За што скародзілі кап'ямі
Татарам рэбры.

Засявалі...
І рудою палівалі,
І шаблямі скародзілі.
Урадзіла рута, рута —
Волі нашае атрута.

А я, неразумны, на тваіх руінах
Марна слёзы трачу... Заснула Украіна
Бур'янам укрыта, цвіллю зацвіла,
У балоце, лужы сэрца прагнаіла
І ў дупло гнілое гадзін напусціла,
А дзецям надзею ў стэпу аддала.
А надзею
Вецер па полю развеяў,
Хваля морам панясла.
Няхай-жа вецер ўсё разносіць
На неакраеным крыллі,
Няхай-жа сэрца плача, просіць
Святое праўды на зямлі.

Чыгрыне, Чыгрыне,
Дружа мой адзіны.
Ты праспаў лясы і стэпы
І ўсю Украіну.
Спі-ж, павіты гандлярамі,
Покі сонца ўстане,
Покі тыя недалеткі
Падрастуць — гетманы.

Памаліўся-б і я-б заснуў,
Дык думкі-закляцці
Рвуцца душу апаліць мне,
Сэрца разарваці.
Дык не рвеце, не паліце.
Мо' вярну нанова
Маю праўду гаротную
І ціхае слова.

Можа выкую з яго я
Да старога плуга
Новы лемеш і чарэсла
І ў цяжар упруга
Можа ўзару пералог той,
А на пералозе
Я пасею мае слёзы,
Ды шчырыя слёзы.
Можа ўзыдуць і вырастуць.
Нажы на два бокі,
Расчвартуюць гніласць сэрца,
Боль яго глыбокі.
І выцадзяць сукравіцу
І вальюць жывое
Казацкае крыві свежай,
Чыстае, святое.
Можа... можа... А між імі,
Між важоў нанова
Рута, мята разаўецца,
Забытае-ж слова
Маё слова смутку, суму
Богабаязліва
Успомніцца, — І дзявоча
Сэрца палахліва
Страпянецца, як рыбанька
І мяне згадае...
Слова маё, слёзы мае
Раю ты мой, раю.

Спі, Чыгрыне. Няхай гінуць
У ворага дзеці.
Спі, гетмане, покі ўстане
Праўда тут на свеце.

Масква, 1844 г. 19.II.

———o———

„НЯВОЛЬНІК“

(Урывак з паэмы)

Думы мае маладыя,
Памершыя дзеці,
Не лятаюць з таго свету
Пустку абагрэці.

Пакінулі сіратою
З табою адною,
Маё сэрца, мая зорка,
Раю мой, спакою.

Ды хто знае рай мой светлы.
Ты сама не знаеш,
Што вітаеш нада мною,
Як зора над гаем.

І гляджу я, пазіраю,
А ты, мая зорка,
Спускаешся нізюсенька
З ціхаю гаворкай.

Усміхнешся ды паглядаіш.
Я гляджу, не бачу.
Прахаплюся — плача сэрца
І вочы заплачуць..

Дзякуй, зоранька. Мінае
Няясны дзень мой. Уміра́е,
Над галавой ужо трасе
Касою смерць. І пахаваюць.
А там і след мой занясе
Халодным ветрам. Усё мінае
І ты выпадкам прачытаеш

Злітую слязамі
Маю думу і ціхімі,
Ціхімі славамі
Прагаворыш: «Я любіла,
Я яго любіла,
І ён не знаў»... Зорка мая.
На маю магілу
Свяці зорка. А я буду
З-за свету лятаці
І пра цябе, маё сэрца,
На небе спяваці.

Н. ЗЕЛЕНОЎ

„ВАЙНА І МІР“, ЯК НАРОДНАЯ ЭПАПЕЯ

«Вайна і мір»—адзін з самых складаных, і ў той-жа час геніяльных твораў сусветнай літаратуры.

Многія крытыкі-вульгарызатары характарызавалі «Вайну і мір», як дваранскую эпапею, у якой рускае дваранства Талстым паказана з самага выгаднага боку... Між тым гэтыя крытыкі недаацэньвалі ці не бачылі таго, што Талстой у сваёй эпапеі выступіў «цвярозым рэалістам», выкрывальнікам дваранскага правячага класа, усёй палітычнай дзейнасці правячых вярхоў.

У сваёй эпапеі Талстой безагаворачна асуджвае ўсю грамадска-палітычную і вайсковую дзейнасць прадстаўнікоў правячага класа, у чым-бы яна ні выражалася: ці ў вайсковых дзеяннях рускіх генералаў супроць Напалеона, ці ў жудасным забойстве генерал-губернатарам Растопчыным Верашчагіна, ці ў раскідваемых Растопчыным пракламацыях, ці ў дзяржаўных праектах Сперанскага. Жыццё вышэйшага прыдворнага грамадства Талстым у рамане паказана таксама адмоўна. Прыгадаем сям'ю міністра Васілія Куракіна, гасціную фрэйліны Анны Паўлаўны Шэрэр з усімі яе гасцьмі.

І не выпадкова, калі з'явіўся ў друку раман «Вайна і мір», рэакцыйныя колы дваранства сустрэлі гэты раман нязычліва і абурана. Крытык Вяземскі пісаў: «Навошта ў парыве юмару, аднак, даволі сумніцельнага, насяляць сход 15 чысла, якое ўсё-ж застаецца гістарычнай датай, старымі падслепаватымі, бяззубымі, плямшывымі, аплыўшымі жоўтым тлустам ці зморшчанымі і худымі». Характарызуючы грамадска-палітычнае значэнне «Вайны і міру», другі сучаснік Л. Н. Талстога, крытык Н. Н. Страхаў пісаў аб вялікай эпапеі: «Можна прыняць гэтую кнігу за самае яркае выкрыццё александраўскай эпохі, за непадкупнае выкрыццё ўсіх язваў, на якія яна хварэла. Выкрыты своекарыслівасць, пустата, фальшывасць, распуста, глупасць тагочасных колаў, бессэнсоўнае, гультайнае, абжорлівае жыццё маскоўскага грамадства і багатых памешчыкаў..., найвялікшыя беспарадкі ўсюды, асабліва ў арміі ў часе вайны».

Найбольш рэзка адмоўныя адносіны да палітычнай дзейнасці правячых дваранскіх вярхоў незалежна ад прыналежнасці да нацыянальнасці, да дзяржавы ў Талстога выразіліся ў абрысоўцы Напалеона.

Напалеон у «Вайне і міры», ўвасабляе сабою антынародны, нярускі, замежны, варожы характару рускага народа пачатак. З вобразам Напалеона Талстой звязвае жыццё адарваных ад народа дваранскіх пецярбургскіх вярхоў. Усе адмоўныя персанажы ў Талстога незалежна ад прыналежнасці да нацыянальнасці і да дзяржавы звязаны ў той ці іншай ступені з вобразам Напалеона. У адпаведнасці з гэтым з усёй многастайнасці тэм, сюжэтных ліній і вобразаў у рамане рэзка вылучаюцца два палярна процілеглыя ідэйна-тэматычныя цэнтры, аб'яднаныя адзіным замыслам аўтара.

Да першага цэнтра мы аднясем усё палітычнае жыццё правячых класаў Расіі, Францыі, Аўстрыі, Прусіі.

Да другога цэнтра аднясем жыццё рускага сялянства, народных мас. Вяршыняй першага ідэйна-тэматычнага цэнтра будзе з'яўляцца вобраз Напалеона. Вяршыняй другога цэнтра будзе з'яўляцца вобраз Платона Каратаева.

Усе любімыя талстоўскія героі не толькі даны антаганістычна да напалеонаўска-пецярбургскага цэнтра,—але ў значнай ступені яны Талстым звязваюцца з народным цэнтрам, вяршыняй якога быў вобраз мужычка Платона Каратаева

У адпаведнасці з гэтым жыццю дваранскіх ваенна-бюракратычных вярхоў Талстой процістаўляе жыццё лепшых людзей з дваран дзекабрысцкай і перадзекабрысцкай эпохі, якія ў той ці іншай ступені былі звязаны з перадавымі разумовымі плынямі эпохі.

Па першапачатковаму замыслу Талстой хацеў напісаць раман «Дзекабрысты». У ім ён намерваўся паказаць лепшых прадстаўнікоў дваранства. Замест эпохі дзекабрыстаў Талстой паказаў эпоху 1805—1812 гадоў. Але і ў «Вайне і міры» сувязь з першапачатковым замыслам праследжваецца простым няўзброеным вокам. У эпілогу гаворыцца аб удзеле П'ера Безухава ў тайных дзекабрысцкіх арганізацыях. У П'еры Безухаву і Андрэі Балконскім Талстой паказвае ідэйныя шуканні перадавых людзей таго часу.

І Андрэй Балконскі і П'ер Безухоў, часткова ў пачатку звязаныя з напалеонаўска-пецярбургскім цэнтрам, тым не менш даны Талстым у плане адштурхоўвання ад гэтага ненароднага цэнтра.

У крытыцы даўно ўжо адзначалася, што Талстой жыццю чыноўна-бюракратычных пецярбургскіх вярхоў дваранства процістаўляў жыццё сядзібнага дваранства аддаючы свае сімпатыі апошняму Многія крытыкі ў гэтым бачылі барскі арыстакратызм Талстога, апяванне сытага сядзібнага жыцця.

Аднак, гэтая катэгорыя крытыкаў недаацэньвала таго, што Талстой любіў процістаўляць прыватнае сямейнае жыццё сваіх герояў палітычнаму жыццю правячых вярхоў. На гэтым процістаўленні пабудаваны раманы і «Анна Карэніна» і «Вайна і мір». Гэтым абумоўліваюцца і жанравыя асаблівасці рамана «Вайна» і мір», які з'яўляецца ў значнай ступені сямейна-бытавым раманам, дзе лінія гістарычная пераплятаецца з сямейна-бытавой. Талстой з вялікімі падрабязнасцямі апісвае сямейна-сядзібнае жыццё сваіх становучых герояў, як Балконскіх, Растовых, сямейнае жыццё П'ера Безухава і Наташы Растовай, Нікалая Растова і Марыі Балконскай. Цікавасць Талстога да прыватнага жыцця сваіх персанажаў родніць вялікага рэаліста з А. С. Пушкіным У інтарэсе Пушкіна і Талстога да прыватнага жыцця ўласных персанажаў сказваўся разрыў абодвых вялікіх мастакоў з дваранскім класам, адыход ад дваранскага грамадства да народных нізоў. Нездарма і Талстой і Пушкін любілі маляваць прыватнае сямейнае жыццё любімых сваіх дваранскіх герояў на фоне сельскага жыцця ў абкружэнні сялян. Гэтым тлумачыцца і тое, што калі пейзаж горада ў Талстога займае скромнае месца, то пейзаж вёскі, наадварот, адыгрывае ў рамане вялікую ролю.

Блізкасць да народа любімых Талстым дваранскіх герояў пуката выдзелена пры паказе сям'і Растовых, у асаблівасці ў момант святочных урачыстасцей у маёнтку Растовых—Отрадным. Не выпадкова і тое, што імем Каратаева Талстой апраўдвае шчаслівае сямейнае жыццё П'ера Безухава і Наташы Растовай.

На вобразе Наташы Растовай і П'ера Безухава, у сустрэчы П'ера з Платонам Каратаевым, у кульце каратаеўшчыны ў сям'і Безухавых ярчэй за ўсё паказана Талстым гэтая сувязь любімых Талстым дваранскіх герояў з народным каратаеўскім цэнтрам. Сустрэча П'ера Безухава з Каратаевым па сутнасці і з'яўляецца асноўнай кропкай перасячэння ўсіх шматлікіх сюжэтных ліній рамана Гэтую блізкасць сваіх любімых герояў з народам, з каратаеўскім цэнтрам Талстой адзначае і пры дапамозе шматлікіх мастацкіх дэталяў, у прыватнасці і па партрэтыцы і мове персанажаў. Гаворка П'ера Безухава і Наташы Растовай бясспрэчна цягацее да народна-сялянскай гаворкі Платона Каратаева. І П'ер Безухаў і Наташа пераважна гавораць на рускай мове, у той час як і сям'я князя Куракіна і госці Анны Паўлаўны Шэрэр і ўсё прыдворна-арыстакратычнае грамадства пераважна гавораць на французскай, г. зн. на чужой, ненароднай мове. Талстога не раз упікалі за захапленне яго французскай мовай, у гэтым бачылі арыстакратызм Талстога. Між тым сапраўдныя сімпатыі Талстога ўскрываюцца ў адналенні Талстым прыказачнай народнай мовы Платона Каратаева. І, наадварот, французскай мовай, на якой гаворыць галоўным чынам прыдворнае грамадства, Талстой адцяняе ненароднасць, адарванасць ад народа гэтага грамадства.

Збліжаючы сваіх любімых герояў з народам, Талстой народныя масы і робіць асноўным станоўчым героем усяго твору.

Талстой палемізуе з буржуазна-дваранскімі гісторыкамі, пісаўшымі гісторыю як гісторыю цароў, палкаводцаў, генералаў, а не як гісторыю народа. Талстой у «Вайне і міры» ўслед за Пушкіным, яго «Барысам Гадуновым», паказвае, што сапраўднай рухаючай сілай гістарычных падзей з'яўляецца народ

Ідэяй народнасці прасякнута ўся гэта гераічная, велічная эпапея. У сваім дзенніку С. А. Талстая перадае словы Л. Н. Талстога, сказаныя ім аб «Вайне і міры»: «У «Вайне і міры» люблю думку народную ў выніку вайны дванаццатага года».

І сапраўды, у «Вайне і міры» Талстой выступае як народны пісьменнік, пісьменнік-патрыёт, які глыбока любіць і свой народ і сваю радзіму.

Чырвонай ніткай цераз увесь раман праходзіць думка аб тым, што вайна 1812 года была народнай вайной, што з напалеонаўскім нашэсцем на Расію змагаўся ўвесь рускі народ, што выратавалі Расію не чыноўнікі, не генералы і ўсялякія распарадчыкі, а выратаваў Расію сам народ, падняўшыся на абарону радзімы ад інтэрвентаў. «Мэта народа была адзіная,—пісаў Талстой у 4-м томе «Вайны і міру»,—ачысціць сваю зямлю ад нашэсця». І ў тым-жа 4-м томе ён пісаў: «Дубіна народнай вайны паднялася з усёю сваёю грознаю і велічнай сілай».

Вось чаму Талстой, так спачувальна паказваючы вайну 1812 года, у той-жа час адмоўна аднёсся да перанясення вайны пасля выгнання Напалеона на тэрыторыю Заходняй Еўропы.

Талстой услед за пушкінскай «Барадзінскай гадавінай» і лермантаўскім «Барадзіным» настойліва праводзіў думку, што сапраўдным героем, перамогшым Напалеона, быў сам рускі народ. Аб гераізме рускага народа Талстой расказаў у апісанні ўсяго паходу 1812 года і ў асаблівасці ў апісанні Барадзінскага бою: «Барадзінскі бой» ёсць лепшая слава рускай зброі, ён—перамога» —пісаў Талстой аб Барадзіне ў адным з чарнавікоў «Вайны і міру».

Талстой з любоўю малюе рознастайных простых, бясхітрасных, па сутнасці зусім не ваяўнічых, але чэсна выконваючых свой абавязак перад радзімай людзей з народнай масы, пачынаючы з армейскага капітана Тушына і канчаючы Платонам Каратаевым. І фельдмаршал Кутузаў абмаляваны Талстым станоўча перш за ўсё таму, што ён як палкаводзец ажыццяўляў волю ўсяго шматмільённага рускага народа. Талстой малюе Кутузава як народнага героя. Ён паказвае ў Кутузаве гуманныя і чуткія адносіны да салдацкіх мас, блізкасць яго да салдацкіх мас, любоў да яго салдацкіх мас. Гэтым і абумоўліваецца ў Талстога псіхалагічнае родства вобразаў Кутузава і Платона Каратаева, родства, якое не раз адзначалася ў крытыцы.

Высунуўшы на пярэдні план вобраз Платона Каратаева, увасабляўшы сабою ў рамане народны пачатак, дух рускага народа, Талстой сам за ўсім падзяляў мужыцкую філасофію Каратаева і на ўсе гістарычныя падзеі глядзеў вачамі гэтага мужычка. І тое, што Талстой здолеў паглядзець у сваёй геніяльнай эпапеі на гістарычныя падзеі вачмі народа, у гэтым была веліч Талстога, гэта рабіла яго—па словах Владзіміра Ільіча, — «мацёрым чалавечышчам».

Але калі, з аднаго боку, у гэтым сказваліся моцныя бакі талстоўскай творчасці, як пісьменніка, безагаворачна парваўшага з эксплаататарскім класам і прышоўшага да народа, то, з другога боку, у гэтым былі і слабыя бакі яго творчасці, паколькі ён пагляд͏зеў на свет вачмі патрыярхальнага наіўнага селяніна. Становучая праграма каратаеўшчыны, падзяляемая Талстым, была глыбока рэакцыйная. У каратаеўскай філасофіі азіяцкага фаталізма, у апалітызме, у роўнадушнасці да палітычнай барацьбы, у непраціўленні злу гвалтам раскрываліся характэрныя рысы будучай талстоўшчыны, якія ўсё больш моцна праяўляліся ў далейшых творах вялікага пісьменніка і якія былі люстрам «слабасці, недахопаў нашага сялянскага паўстання», адлюстраваннем «мяккацеласці, патрыярхальнай заскарузлай баязлівасці «гаспадарчага мужычка» (Ленін, т. XII, стар 334).

Адмятаючы ў бок рэакцыйныя вывады каратаеўскай талстоўшчыны, мы разам з тым высока цэнім і любім раман «Вайну і мір», як вялікую народную эпапею, якою ганарыцца вялікі рускі народ.

„ПРАФЕСАР МАМЛОК“

(Вытворчасць студыі Ленфільм)

Фільм «Прафесар Мамлок» можна назваць у нейкай ступені гістарычным. Час дзеяння фільма — часы першых дзён крывавага ап'янення нямецкага фашызма, які дарваўся да ўлады. Падзеі разыгрываюцца яшчэ ў дні правакацыйнага падпалу рэйхстага. І крыху адышоўшым у нядаўнае мінулае здаецца асноўны вобраз фільма—прафесар Мамлок. Яго думкі, дзеянні і палітычнае светаадчуванне, аж да няўдаўшагася самагубства, пасля якога ён зэнсоўваў сапраўднае становішча сваёй краіны, характэрны іменна для большасці заходняй інтэлігенцыі таго часу. Іменна тады сярод інтэлігенцыі яшчэ былі ў ходу розныя тэорыі служэння «чыстай навуцы», «чыстаму мастацтву», моднымі былі антыпалітычныя настроі. Усе гэтыя настроі і плыні ў іх чыстым выглядзе выражае прафесар Мамлок.

Разгар карычневай чумы ў Германіі застае прафесара Мамлока ў апагеі яго навуковага і асабістага росквіту. Прафесар кіруе буйнай хірургічнай клінікай у Берліне, папулярнасць якой была вядома далёка за межамі краіны. Любоў і павага да яго з боку ўсяго калектыва і хворых клінікі бязмежныя, яго аўтарытэт у навуковым звеце непахісны. Той-жа спакой і ўпэўненасць пануюць і ў доме Мамлока. У яго сям'і свае ўстаяўшыеся законы і традыцыі, свая культура—культура забяспечанай нямецкай сям'і. Рольф—сын прафесара, працуе разам з бацькам у клініцы ў якасці асістэнта. Разумнага і таленавітага Рольфа таксама чакала вялікая навуковая будучыня. Дружба сына і бацькі, змацаваная агульнай любоўю да навукі, была нязмерна глыбокай. Але бацька-Мамлок не ведаў аднаго: ён не ведаў, што Рольф комуніст, што часта ўпотайку ад бацькі Рольф збіраў у сябе ў доме падпольны камітэт. Толькі выпадкова прафесар выяўляе ў сваім доме чарговы сход падпольнага камітэта. Абурэнню прафесара не было граніц. Якія адносіны маюць палітычныя агітатары да дома вучонага! І прычым тут Рольф?

— Ты павінен будаваць сваё жыццё па вобразу вялікіх вучоных.. Коха, Пастэра, тваё месца за мікраскопам, а не на палітычных сходах!..—гнеўна маралізуе прафесар, выклікаўшы Рольфа да сябе ў кабінет. І зараз прафесар паставіў перад сынам катэгарычнае патрабаванне: ці сям'я і сумесная работа, ці палітычнае падполле. То і другое было абсалютна несумяшчальным у разуменні прафесара. Рольф абраў апошняе і пакінуў бацькоўскі дом. Прафесар думаў, што з адыходам сына палітыка і палітычная барацьба пакінулі яго спакойна займацца сваёй любімай навуковай дзейнасцю, але яна ўварвалася да яго ў дзверы клінікі ў вобразе атрада карычневых грамілі пад камандай фашыста бяздарнага доктара Гельпаха. Стукаючы ботамі па карыдорах і палатах клінікі, як па пляцу, доктар Гельпах прышоў з атрадам штурмавікоў і абвясціў сябе камісарам клінікі. «Чыстакроўныя немцы не адчуваюць патрэбы ў паслугах яўрэя»,—ва ўпор заявіў Гельпах Мамлоку. У разарваным халаце, з чорным надпісам «яўрэй», штурмавікі вядуць славутага прафесара па вуліцы. Гельпах выгнаў Мамлока з клінікі. Мамлок рашыў зрабіць тое, што рабілі і робяць зараз у фашысцкай Германіі тысячы людзей, апынуўшыся ў яго становішчы. Ён страляе ў сябе. Між іншым, якая злая іронія гісторыі! Мамлок страляе ў сябе з рэвальвера, якім ён быў узнагароджаны за храбрасць пад Вердэнам у 1916 годзе.

Але рана аказалася не смяротнай, яго сябры-ўрачы выратавалі яму жыццё. І толькі зараз, лежачы на бальнічнай койцы, Мамлок многае перадумаў і пераацаніў. Мамлок зараз маўкліва ганарыцца сваім сынам, ён захапляецца Дзімітравым, выступаючым на лейпцыгскім працэсе ў гераічным паядынку з азвярэлым фашызмам. Мамлок і сам зараз не можа спакойна ляжаць. Ён выходзіць на балкон. Тысячны натоўп народа на пляцу апапілі штурмавікі. Яны ловяць уцёкшага з Гестапо Рольфа. Мамлок звяртаецца да народа з гарачай палітычнай прамовай, у якой кляйміць сёнешнюю Германію—краіну крыві і катаванняў, краіну вайны і катаў. Кароткая кулямётная чарга афіцэра абрывае яго страсную прамову, а разам з гэтым і жыццё. Мамлок забіты. Але калі-б ён і застаўся жывым, то з упэўненасцю можна сказаць, што ён не застаўся-б у Германіі. Ён пакінуў-бы яе, як пакінулі сотні выдатных дзеячоў навукі і мастацтва, далучыўшыся да міжнароднага антыфашысцкага фронта. Лёс прафесара Мамлока—лёс усёй прагрэсіўнай германскай інтэлігенцыі першых год фашысцкага тэрора.



КАДР З ФІЛЬМА «ПРАФЕСАР МАМЛОК». Злева—артыст-ордэнаносец О. Жакаў у ролі Рольфа і артыстка Н. Шатэрнікава ў ролі доктара Інге.

У асяроддзі сёнешняй германскай інтэлігенцыі цяжка ўжо сустрэць падобных прафесару Мамлоку. Для сёнешняй германскай інтэлігенцыі, перажыўшай за апошнія годы рэзкую палітычную дыферэнцыяцыю, ужо не існуе праблемы «навука, ці палітыка». Сення ўжо можна гаварыць аб двух асноўных лягерах, раздзяляўшых яе: фашысцкім і антыфашысцкім. Прамежная праслойка зараз не тыповая. Вось чаму вобраз прафесара Мамлока характэрны толькі для вядомага прайшоўшага германскай інтэлігенцыяй перыяда.

Але разам з тым, уся карціна ў цэлым з'яўляецца яркім мастацкім дакументам, востра накіраваным супроць фашысцкага мракабесся іменна сёнешняй Германіі. Актуальнасць карціны настолькі вострая, што яе можна смела аднесці да ліку лепшых антыфашысцкіх твораў мастацтва, выкрываючых чалавеканенавісніцкую сутнасць фашызма. Метады знішчэння людзей, атмасфера змрочнага сярэдневяковага ўдушша і сёння засталіся такімі-ж, якімі яны былі ў першы час. І карціна з узрушаючай амаль дакументальнай дакладнасцю паказвае змрочны сярэдневяковы каларыт сёнешняй Германіі. Глыбокі ўнутраны страх на тварах вулічнага натоўпу, тэрарызаванага бясконцымі пагромамі, звон пабітага шкла, треск ламаемай прыкладамі мэблі ў рабочых кватэрах, гумавыя дубінкі, дулы вінтовак і кулямётаў, накіраваныя ў вокны дамоў і ў натоўпы народа, і, нарэшце, страшныя засценкі Гестапо з катаваннямі праходзяць перад гледачом. Усё гэта настолькі правільна і жудасна, што мімаволі ўспамінаюцца словы прафесара: «У такой Германіі жыць страшна». Можа таму так захапляюць вобразы падпольшчыкаў—гераічных германскіх комуністаў, што яны гатовы ісці на смерць, каб завяваць радаснае жыццё.

Рольф, Эрнст, Анні, Фрыц, Хільда—байцы падполля, людзі, якіх не пакідае пачуццё жыццёвага аптымізма і веры ў сваю канчатковую перамогу. Пад кіраўніцтвам германскай компартыі народ усё-ж вызваліцца ад карычневай чумы—такое адчуванне ад усяго фільма ў цэлым. Карціна шчыра і глыбока хвалюе. Хвалюе лёсам сваіх герояў, трагічнай развязкай асноўнага вобраза, хвалюе майстэрствам акторскага ўвасаблення. З першага паяўлення ў кадры прафесара Мамлока нельга не адчуваць нейкае радаснае задавальнение і ўдзячнасць рэжысёрам за тое, што яны выбралі на роль прафесара Мамлока іменна засл. арт. Межынскага. Разумна, з густам і з танчэйшым пачуццём меры здолеў пабудаваць гэты найскладанейшы вобраз засл. артыст Межынскі. Вобраз Мамлока поўны вялікіх трагічных пачуццяў і рухаў, але актор Межынскі старанна ахоўваў іх ад афекта, істэрыі і таннай меладрамы. Тэатральны актор аказаўся на-дзіва таленавітым майстрам кіно.

Гэтага нельга сказаць аб засл. арт. Нікіцінай (жонка Мамлока). Арт. Нікіціна цалкам перанесла на экран сцэнічную мізансцэну і чыста сцэнічную «ігру». Гэта вельмі заўважна, таму што ў карціне тэатральныя прыёмы арт. Нікіцінай адзінкавы. Усе астатнія акторы іграюць у плане добрай кінематаграфічнай школы. Цудоўны ўзор гэтай школы дае арт. ордэнаносец Жакаў (Рольф), выхаваны на лепшых традыцыях рэалістычнай школы кінематографа.

Поспех карціны забяспечаны не толькі таленавітай ігрой актораў. Ён быў закладзены ў самай п'есе вядомага антыфашысцкага драматурга Фрыдрыха Вольфа. Вострыя драматургічныя становішчы, яркі цікавы дыялаг, чоткая жыватрапечучая ідэя—далі магчымасць і акторам і рэжысёрам Мінкіну і Рапапорту стварыць па гэтай п'есе таленавітую антыфашысцкую карціну, якую нельга глядзець без хвалявання.

К. ГУБАРЭВІЧ.

Навучальны год у тэатральным вучылішчы

1 верасня бягучага года ў строй спецыяльных навучальных устаноў БССР уступіла рэспубліканскае тэатральнае вучылішча—кузня акторскіх кадраў для тэатраў БССР.

Патрэбнасць у такой навучальнай установе наспела ўжо даўно. Дзяржаўная тэатральная сетка за апошнія гады бурнага росквіту беларускай соцыялістычнай культуры вырасла да 17 адзінак.

У тэатрах БССР, у Кансерваторыі і ў іншых установах беларускага мастацтва ёсць дастатковая колькасць людзей, якія могуць стаць педагогамі вядучых дысцыплін у вучылішчы, людзей, здольных перадаць увесь свой багаты творчы вопыт будучым новым тэатральным кадрам. Частка гэтых людзей вырасла ў беларускім совецкім мастацтве з радавых актораў да таленавітых рэжысёраў, мастацкіх кіраўнікоў тэатраў (Міровіч, Рахленка, Галаўчынер, Зораў і інш.). Частка з іх прыехала ў БССР нядаўна з буйных тэатральных цэнтраў братніх рэспублік (Рапапорт, Лімонэ, Палічынецкі, Леонгард і інш.).

Цяга ў тэатральныя навучальныя ўстановы таленавітай совецкай моладзі велізарна (за адзін месяц пасля некалькіх публікацый у газетах на 70 месц было пададзена 450 заяў).

Нягледзячы на ўсё гэта, ворагі народа, якія прабраліся да кіраўніцтва фронтам культуры і мастацтва, з года ў год старанна выкрэслівалі з народнагаспадарчага плана стварэнне ў БССР такой навучальнай установы.

Прайшоўшыя конкурсныя прыёмныя іспыты паказалі, што цяга беларускай совецкай моладзі ў тэатр, у мастацтва цалкам апраўдана. З 400 чалавек, з'явіўшыхся на іспыты, у выніку вельмі строгага, стараннага адбору прынята ў вучылішча на 1 курс 60 чалавек. Гэта велізарны процант, нябачаны ва ўмовах конкурснага адбору ў тэатральную навучальную ўстанову па класу акторскага майстэрства.

З прынятых на 1 курс студэнтаў пераважная большасць прыпадае на калгасную моладзь глыбінных раёнаў БССР. Амаль усе прынятыя ў тэатральнае вучылішча ў мінулым—актыўныя ўдзельнікі драматычнай самадзейнасці.

Можна з упэўненасцю сказаць, што большасць прынятых на першы курс па заканчэнні вучылішча, праз чатыры гады, уваль'юцца ў нашы тэатры зусім падрыхтаванымі і ўсебакова развітымі совецкімі акторамі.

На аснове пастановы СНК БССР у тэатральным вучылішчы на II курс перададзена 25 чалавек з былой кіно-акторскай школы Белдзяржкіно. Такім чынам, на новую навучальную ўстанову з першага года яе існавання партыяй і ўрадам ускладзены адказнейшыя задачы: сканцэнтраванне ў сваіх сценах справы падрыхтоўкі акторскіх кадраў як для тэатраў БССР, так і для Беларускай кінематаграфіі. Першы выпуск маладых совецкіх актораў павінен быць не праз чатыры гады, а праз тры.

Калі па некаторых прычынах (галоўным чынам у сувязі з гастрольнай паездкай Белдзярждрамтэатра) мы зараз не можам увесці на 1 курсе дысцыпліны «акторскае майстэрства»,—а яна будзе ўведзена неадкладна па звароце майстроў з гастрольнай паездкі,—то на II курсе спецыяльныя прадметы ўведзены з першага дня. Зараз на II курсе выкладаюцца дысцыпліны: акторскае майстэрства, рытміка, гісторыя антычнага тэатра, гісторыя антычнай і заходняй літаратуры, музграмата, танец і інш. Ва ўмовах часова займаемага памяшкання не можа быць уведзена фізічнае выхаванне актора і тэхніка сцэнічнай гаворкі—з прычыны адсутнасці педагога.

Педагогамі ўсе прадметы, за выключэннем тэхнікі сцэнічнай гаворкі, гісторыі прасторавых мастацтваў і грыма (дзве апошнія дысцыпліны ўводзяцца па вучэбнаму плану на трэцім курсе),—забяспечаны.

Зацягнуўшаеся будаўніцтва Вялікага опернага тэатра, а разам з ім і памяшкання тэатральнага вучылішча, не дало магчымасці з першага-ж дня поўнасцю разгарнуць вучэбнае і грамадскае жыццё навучальнай установы. Вучэбны год з гэтай прычыны (адсутнасць вучэбнага памяшкання) быў пад пагрозай зрыву. Клопаты і ўвага да вучылішча з боку ЦК КП(б)Б забяспечылі пачатак вучэбнага года і нармальны вучэбны працэс у памяшканні партыйных курсаў ЦК КП(б)Б.

Нягледзячы на дзве пастановы СНК БССР, якія абавязваюць Упраўленне па справах мастацтваў фарсіраваць будаўніцтва інтэрната тэатральнага вучылішча, гэтая справа рухаецца злачынна павольна. Покуль-што студэнты размешчаны па розных кватэрах. Маркуючы па тэмпах будсектара Упраўлення і яго начальніка Ходаса, да новага вучэбнага года, да новага набору інтэрната не будзе, што фактычна можа сарваць чарговы набор і нармальную вучобу.

Тэатральнае вучылішча створана. Яно ўжо працуе. Ідэя яго арганізацыі сустрэта тэатральнай грамадскасцю БССР і іншых рэспублік з вялікім задавальненнем. Тым больш трэба асобным кіраўнікам нашых тэатраў не абмяжоўвацца голымі дэкларацыямі, а дапамагчы вучылішчу. У адзінай тэатральнай навучальнай установе БССР гэтым таварышам трэба працаваць, не спасылаючыся на загрузку ці на іншыя прычыны.

Стварэнне тэатральнага вучылішча ў БССР—чарговая перамога партыі і совецкага ўрада на фронце культурнага будаўніцтва нашай квітнеючай рэспублікі. Трэба ў найкарацейшы тэрмін забяспечыць усе неабходныя ўмовы, поўнасцю забяспечыць усе спецыяльныя дысцыпліны педагогамі, паскорыць пераход вучылішча за ўласнае памяшканне, перыядычна запрашаць буйных спецыялістаў тэатральных цэнтраў СССР, паскорыць будаўніцтва інтэрната.

Вучэбны год пачаўся і зараз перад кіраўніцтвам і студэнтамі стаіць важнейшая задача паспяхова выконваць вучэбную праграму.

Пад кіраўніцтвам і пры дапамозе партыйных і совецкіх арганізацый першы атрад маладых совецкіх актораў праз тры гады ўваль'ецца ў тэатры БССР, як воьбіт і арганізатар большэвіцкага мастацтва, совецкай культуры.

А. СЯРГЕЕЎ.



У музеі С. М. Кірава ў Ленінградзе.
НА ЗДЫМКУ: ля скульптурнай групы «С. М. Кіраў на апацітах».
Фота Б. Дарафеева (СФ).

Ів. ГРАМОВІЧ

Трапіла каса на камень

(Урывак з аповесці «Чужы грунт»)

Сын пісаў, што на граніцы яго ўзнагародзілі імяннай зброяй. Бацька, сівы дзед Ермалай, згортваючы прачытаны ліст, казаў:

— Па мне ўдаўся Павел, увесь, як я...

Ён паправіў акуляры, аглядаючы на сцяне фатаграфіі, і дапытліва акінуў позіркам хату. У святліцы было сонечна, роўна цікаў гадзіннік. Ермалай падумаў і ўсміхнуўся.

Некалі пры выгане пад вярбой стаяла лядашчая ермалаева хата. У ёй не было падлогі, чорная, закураная дымам столь нізка вісела над галавой. Яшчэ ніжэй сядзелі дзверы: заходзіш—абавязкова нагінайся. Тыя дзверы паставілі невялікі знак у біяграфіі Ермалая. Помніцца, у вяселле, перад японскай вайной, вышла цэлая гісторыя. Прыехаў Ермалай з-пад вянца, злез з воза, пад руку маладую вядзе ў хату. Ён у гэтай кузні гадаваўся, узрос і цяпер, як звычайна, нагнуўся ў нізенькіх дзвярах, пераступаючы парог. А маладая жонка ўпершыню ішла, вэлюм засланіў вочы—не відаць было і не нагнулася пры ўваходзе. Назаўтра госці вяселяцца, а маладая каля маладога сумная, глянуць на ўсіх не можа: над вокам за ноч сіні гуз, як шышка, ускапіўся. Казалі, каб не стрымала сям'я маладога ў той момант, ён пасеквы тыя старасвецкія, бацькаўскія вушакі дзвярэй. З ім жарты малыя; ён такой натуры чалавек. Але цесць узяў яго за рукі і сказаў:

— Ей гуз не на век. Сойдзе і знаку не будзе. Сам жыў ды здароў будзеш, новую хату як збудуеш... Уставіш дзверы фелянговыя, высокія, як у царкве.

Ермалай тады асцепяніўся, паклаў сякеру і стаў рыхтавацца па вяселлі перасыпаць хату. Некальки год ён мерыўся, аж у даўгі залез, але не перабудаваўся. Забралі яго на японскую вайну. Жонка Кацярына была надзею страціла бачыць яго. Колькі было слёз, ад радасці, як вярнуўся Ермалай. Тымі-ж днямі дэмабілізаваўся ён, пайшлі з сям'ёй да паповага сына і сфатаграфаваліся для памяці. Ермалай атрымаўся на фатаграфічнай картачцы ўдалым ваякам: шапка з цэшкай на бок, «ва фрунт» стаіць і справа Кацярыну трымае, як вінтоўку на парадзе. Злосным тут выдае ён, не так як на картачках пазнейшага часу, дзе сівізна пракідаецца на дзедавым твары і барада распасціраецца ва ўсмешцы. Многа на сцяне партрэтаў вісіць: сына Павела з трыма квадрацікамі, дачкі-настаўніцы і адзін партрэт, што Ермалай трымае на павадку гадаванца-бугая, за якога калгас на выстаўцы прэмію атрымаў. Так што зірнуў дзед на дзверы з двума форткамі, з жоўценькай ручкай, на фарбаваную падлогу і падумаў:

«Яшчэ Павел не бачыў новай святліцы. Прыдзе, то будзе і мне чым пахваліцца...»

У такім адчуванні ўтульнасці дзед ветліва пасыпаў словы, калі з кухні ў святліцу ўвайшоў да старога Андрэй Неруш.

— А-а, дзень добры, Андруша! Людска зрабіў, што зайшоў да мяне. Гэты... Ну, сядай,—і пачаў ганарыцца навіною,—ці чуў пра майго Павела? Вось толькі што ліст Тонісь прынёс. Піша—імяннае мундзіраванне яму надзелі... Імяннае! За асабовыя заслугі, кажа...

Брыгадзір Неруш, малады, але рослы, як бацька, хлопец, без слоў са спачуваннем да старога прысеў на крэсла.

— Я да дзеда па справе...

— Ну?

— Ведаеце... Мы спектакль думаем,.. каб як нам дзед дапамог.

— А-а, — засмяяўся Ермалай,—дапамагчы вам? У лапці мяне абуць хочаце, на сцэну выпхнуць і павыскаляцца са старога?

— Не, дзед, боты скідаць не давядзецца,—засупярэчыў Андрэй, — Там усяго са стральбай хадзіць...

— Ого, са стральбай, і страляць? Што-ж там за п'еса? Той-жа раз вы ставілі... дзе мячыкі скачуць, голыя бегаюць. Неяк не да толку ўсё... прыстаўляюцца дарослыя, як малыя. Мне, старому, там сорамна ўтыкацца... Не стацця...

— Дзед,—перабіў Неруш,—але гэта не такая п'еса. Гэта пра партызан, пра даўнейшае. Вось паслухаеш—плакаць хочацца.

— О, у мяне-ж слёз няма. Я не зладжу там.

— Зладзіш, дзед. Усе-ж просяць...

— Не. Мяне тады бабка спаць не пусціць. Скажа: артыст?! Ідзі да артыстак.

Неруш зразумеў, што дзеда ніяк не ўгаворыш, і змоўк. Тады Ермалай пачаў дапытваць:

— Як там учора вышла?

— Дзе?

— На ферме.

— Нічога.

— Волька-ж казала, што ты Вілюевіча хацеў прабраць. За што гэта?

— Бо ён прахвост вялікі. Мне так здаецца, а як дзед думае?

Дзед Ермалай закурыў люльку.

— Памятаеш палякае адступленне? Хаця, дзе табе памятаць! Ты малы быў, а тут адыходзілі легіёны, на станцыі аглумілі тры цыстэрны спірту. Пакідаць не хацелі, дык па насыпу, па рэйках разлівалі. Усю зямлю змачылі, як дажджом. То гэты самы Антэк Вілюевіч, яго бацька, так напіўся, што памяць страціў. Ляжыць пад насыпам у лужыне спірту і бурболіць. Сербане, і бурболіць. Носам у зямлю даўбае, аж кроў пад вачыма выступіла. Мы пад'ехалі, а ён і ўстаць не можа. Прывезлі яго дадому, паклалі так на падлозе... Вілюевічыха як загалосіць! Ён счарнеў увесь, а рот разяўлены і з горла сіні агеньчык бліск... бліск... Мы раілі паіць яго гэтым самым, чым на двор ходзяць. Нічога не дапамагло!

Неруш агідліва скрывіўся і паглядзеў на ермалаеву кошку. Тая сядзела пад сталом і акуратна ўмывалася лапай.

— А сынок, казаў мне Парамон, такі крутасвет, хітры і, каб дабіцца чаго, то без мыла ўсюды ўлезе.

Андрэй Неруш задумена насупіўся Так ён даводзіў Зіне аб Вілюевічу, але яна не згадзілася з ім. Сышоўшыся зараз з дзедам думкамі, ён бадзёра прагаварыў:

— Праўда, і я так думаю. То гэта-ж ён учора з Косцікам Кароткім бідон зняць хацелі, як дзед па Жоўтабрушку хадзіў... Тут я ім і не дазволіў... Волька бачыла.

Ермалай скінуў акуляры і хуценька заморгаў светлымі вачыма.

Ермалай такой хітрасці Вілюевіча ў дачыненні да сябе яшчэ не чуў.

Бывае такі чалавек—ён з'явіцца выпадкова, пакруціцца сярод кіраўніцтва, яго яшчэ мала хто ведае, але глядзі-ж, ён ужо нібы і начальнік які. Яшчэ ўчора цябе называў па імені і па бацьку, а сёння спаткаў—ідзе з партфелем, не пазнае, пытае, як тваё прозвішча. Такую рысу меў і Стась Вілюевіч. Прыехаў ён сюды, атабарыўся ў цёткі і жыў. Навасёлкі-ж вялікія—ці бачылі многія яго ў вочы, а праўленцы; бухгалтар, рахункавод, касір тымчасам прызвычаіліся да яго, таму што вілюевічаў партабак «Памяць з Каўказа» адчыняўся з папяросамі толькі для выключных асоб. Стась Вілюевіч любіў работу рэвізаваць, дапамагаць старшыні. Вось ён без кіраўнічых санкцый надумаўся праверыць працу калгаснікаў.

Дзед Ермалай кожную раніцу адвозіў малако з калгаснай фермы на сыраварню. Чуеш, барабаняць пустыя бідоны на вуліцы—дзед Ермалай паехаў з сыраварні.

Стасю Вілюевічу мільгнула думка, пачаць свой гаспадарчы агляд са старога. «Як ні кажы, а ўсё-ж ён стары, дык мабыць і са старым духам», — меркаваў ён.

Ермалай-жа, спаткаўшы Вілюевіча (нажаль, у бязлюдным месцы), з пагардаю адпомсціў:

— Ты, гэты самы, начальнічак.. вельмі нос падняў высока... Мяне ўчора на ферме не было, а ўсяраўно-бы вас пугай. Не быў ты ў добрых бацькаўскіх руках. Дзе, скажы мне, ты вычытаў, што каб самому выслужыцца, то другога ўтапіць трэба.

Элегантны, у бліскучых ботах, Стась Вілюевіч супыніўся на сцежцы. Пад шырокім казырком яго шапкі-капітанкі выглядаў заўважна курносы нос.

— Калі ласка, стары, не рыкай на мяне,—мілагучна адказаў ён. І нібы абараняючыся, паглядзеў навокал, — такіх у горадзе міліцыя просіць...


— Каго міліцыя? Мяне?—закрычаў Ермалай. Ды я-ж цябе зараз тут як бочку скачаю. Вон з вачэй, брадзяга, падлізнік сусветны!

Вілюевіч адступіўся і прыняў ветлівы тон.

— Дзеду... дзед...

— Чаго ты сюды прыехаў? Вон адсюль, каб твайго ў Навасёлках і следу не было. Я цябе як аблупленага бачу...

Стась Вілюевіч змоўчыў, адступіўся і памаленьку пайшоў у вуліцу сяла. Яго безабароннага дзед не адважыўся ўдарыць кіем. Дзед Ермалай пасварыўся, на выгане стоячы, і накіраваўся на ферму. Гэта было за сялом. І Вілюевіч рад быў, што такой споведзі ніхто не чуў.



З ЖЫЦЦЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.
НА ЗДЫМКУ: марш кавалерыі.

Фота Захарава (СФ).

НОВЫ АТРАД ЖУРНАЛІСТАЎ

Тры гады таму назад яны, прагныя да навукі, да ведаў, прышлі з розных канцоў рэспублікі ў Комуністычны інстытут журналістыкі БССР імя Кірава. У кожнага была толькі адна мара, адно жаданне — стаць сапраўдным большэвіком-журналістам. Іх залічылі студэнтамі інстытута, далі інтэрнат, забяспечылі добрай стыпендыяй, прадаставілі ўсе ўмовы для работы і творчага росту.

З першага-ж дня яны заселі за кніжкі, поўнасцю аддаліся рабоце; некалі невядомае, туманнае станавілася вядомым, выразным, акрэсленым: навука раскрывала свае таямніцы.

Паміж некалі зусім незнаёмымі людзьмі завязалася моцная дружба. Кожны жыў жыццём калектыва, радаваўся, смяяўся, сумаваў, любіў.

І вось — інстытут скончан. Усюды — у аудыторыях, пакоях, карыдорах — небывалае ажыўленне, у зале грыміць музыка, праплываюць пары танцуючых, гучыць, вырываючыся праз расчыненыя вокны, песня. І неяк так хораша, хораша і разам з тым — сумна, цяжка пакідаць інстытут, расставацца з выкладчыкамі, з якімі так многа перажыта.

Іх, выпускнікоў, сорак. 31 чалавек здалі залікі на добра і выдатна. За тры годы вучобы ў КІЖы яны атрымалі неабходныя для работы ў органах большэвіцкага друку веды і навыкі. У кожнага ў кішэні ляжаць адрасы сяброў, каштоўны, атрыманы стараннасцю, дыплом, накіраванне. Праз некалькі дзён яны раз'едуцца на работу.

Вось выпускнік С. Бачура. Ен накіроўваецца ў абласную мазырскую газету. Ен прышоў у інстытут з ведамі за 6 класаў. Да паступлення ў КІЖ быў селькорам, затым працаваў у рэдакцыі газеты. У яго былі слабыя, негрунтоўныя веды, але ў яго была і вялікая прага да вучобы, стараннасць, упартасць. Крапатлівая штодзенная работа дала станоўчыя вынікі: Бачура нядрэнна засвоіў гісторыю партыі, ленінізм, дыямат, гісторыю народаў СССР, літаратуру, палітэканомію і іншыя вывучаемыя ў інстытуце прадметы, адчувае сябе ў поўнай меры падрыхтаваным для работы ў органах большэвіцкага друку.

— Але я не спынюся на дасягнутым, — абяцае тав. Бачура, — я і надалей буду ўпарта працаваць над павышэннем свайго палітычнага і культурнага ўзроўню. Гэтаму абавязвае высокае званне совецкага журналіста, званне члена ВЛКСМ.

Выпускнік Пеўзнер прызываецца ў гэтым годзе ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. У армію ён ідзе добра падрыхтаваным: стаў планерыстам першай групы па класу «С». Да вучобы ў КІЖы Пеўзнер працаваў на заводзе, у калгасе, пісаў у газеты. Вучоба ў інстытуце ўзбагаціла яго ведамі. Зараз у Пеўзнера вялікая радасць: яго жонка скончыла Менскі медыцынскі інстытут. Нарадзіла прыгожага хлопчыка.

...Шырока леглі шляхі ў жыццё.


Да пабачэння, сябры!
Усяго найлепшага!

Віктар ГАНІН.
Студэнт 2 курса КІЖ.

—о—

Удзел БССР ва Усесаюзным конкурсе вакалістаў

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР зацвердзіла Рэспубліканскі оргкамітэт для распрацоўкі і правядзення раду мерапрыемстваў па ўдзелу вакалістаў БССР ва Усесаюзным конкурсе вакалістаў, абвешчаным Камітэтам па справах мастацтваў. У склад оргкамітэта ўвайшлі прафесары Кансерваторыі П. І. Ціханаў (старшыня) і Н. І. Паніна, дырыжор Белдзяржфілармоніі Мусін, дырыжор Тэатра оперы і балета Шнейдэрман, салістка Тэатра оперы і балета Александроўская, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР кампазітар Туранкоў, начальнік музсектара Упраўлення па справах мастацтваў Рубінштэйн. Першы тур конкурса вакалістаў адбудзецца ў Маскве ў снежні бягучага года.



Падарунак працоўным СССР з Іспаніі. НА ЗДЫМКУ: альбомы рэпрадукцый і манаграфій іспанскіх мастакоў, атрыманыя ад міністэрства народнай асветы Іспаніі.

Фота Г. Шыракова (СФ).

Культурнае абслугоўванне прызыўнікоў і часцей Чырвонай Арміі

Прадпрыемствы мастацтва Менска актыўна ўключыліся ў культурнае абслугоўванне прызыўных пунктаў. У канцэртных вечарах, якія арганізуюцца на прызыўных пунктах, прымаюць удзел ансамбль песні і танца і аркестр народных інструментаў Белдзярж філармоніі, калектыў цырка, брыгада Тэатра оперы і балета і інш. Прызыўнікі сустракаюць выступленні мастацкіх калектываў з вялікім задаволеннем.


Для культурнага абслугоўвання часцей Чырвонай Арміі Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР накіравала тры мастацкія брыгады ў колькасці 21 чалавека. Сярод іх — заслужаная артыстка рэспублікі Александроўская, салісты Тэатра оперы і балета Балоцін і Дзянісаў, салісты аркестра народных інструментаў Філармоніі Савіцкі і Шмелькін, мастацкія чытацы эстрады Новік і Пургін, баяніст-імправізатар Дэмон, артысты балета Хераска, Узунава і інш.

Апрача таго, для культурнага абслугоўвання часцей Чырвонай Арміі выязджае ансамбль песні і танца Беларускай дзяржфілармоніі.

—о—


ДРУГІ КУРС У ТЭАТРАЛЬНЫМ ВУЧЫЛІШЧЫ

Для сканцэнтравання падрыхтоўкі акторскіх кадраў як для тэатраў БССР, так і для Беларускай кінематаграфіі, кіноакторская школа былога трэста Белдзяржкіно, як самастойная навучальная ўстанова, пастановаю Соўнаркома БССР ліквідавана і студэнты кіноакторскай школы ў колькасці 27 чалавек уліліся ў склад рэспубліканскага тэатральнага вучылішча на другі курс.



Заканчваецца будаўніцтва Вялікага тэатра оперы і балета БССР ў г. Менску.

Зарысоўка Н. Гурло.



У Днепрапетроўску адбылася абласная алімпіяда дзіцячай мастацкай самадзейнасці. НА ЗДЫМКУ: лепшыя бандурысты, браты Марк і Андрэй Прэкраціч.

Фота К. Інсарава (СФ).

ПРАСЛУХОЎВАННЕ НОВЫХ КОМСАМОЛЬСКІХ ПЕСЕНЬ

9 верасня ў Саюзе совецкіх кампазітараў БССР адбылося праслухоўванне новых комсамольскіх песень, напісаных беларускімі кампазітарамі да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола. На праслухоўванні прысутнічалі кампазітары, паэты і журналісты.

Кампазітары — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР А. Е. Туранкоў, Равенскі, Палонскі, Сакалоўскі, Шчэглоў і Клумаў выканалі напісаныя імі песні на тэксты маладых паэтаў Калачынскага, Астрэйкі і Радзюка. Комсамолец-кампазітар Падкавыраў напісаў песню «Выше знамя комсомола» на тэкст дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР ордэнаносца Лебедзева-Кумача. У абмеркаванні выступаючыя таварышы зрабілі рад дзелавых заўваг, якія кампазітары ўлічаць у дапрацоўцы сваіх песень. У асноўным ўсе песні арыгінальны, а большасць з іх напісана ў стылі народных беларускіх песень.

Неабходна, каб паэтычная секцыя ССПБ дапамагла кампазітарам і напісала рад тэкстаў для комсамольскіх песень. Газеты на сваіх старонках павінны друкаваць лепшыя комсамольскія песні з нотамі, каб гурткі мастацкай самадзейнасці на месцах маглі развучваць іх. Гэтым самым Саюз совецкіх кампазітараў БССР пры дапамозе друку дапаможа мастацкай самадзейнасці ў стварэнні цікавага рэпертуара да выдатнай гадавіны.

Неабходна, каб праслухоўванне песень адбывалася пры ўдзеле спевакоў, што значна палегчыць успрыняцце твораў і выявіць іх станоўчыя і адмоўныя бакі. Да абмеркавання музычных твораў, прысвечаных 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола, трэба прыцягнуць шырокія колы грамадскасці Менска.

Усебеларуская канферэнцыя совецкіх мастакоў

У апошніх чыслах верасня ў Менску склікаецца ўсебеларуская канферэнцыя совецкіх мастакоў. На канферэнцыі будуць прадстаўлены ўсе члены і кандыдаты саюза, якія прайшлі перарэгістрацыю, у тым ліку звыш дваццаці чалавек з перыферыі. На канферэнцыі пастаўлены наступныя пытанні: прыняцце статута саюза, справаздача оргкамітэта, пытанні надыходзячай выстаўкі, прысвечанай XX-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў, выбары праўлення.

У парадку падрыхтоўкі да канферэнцыі ў Гомель і Віцебск выязджаюць прадстаўнікі оргкамітэта для правядзення папярэдніх сходаў мастакоў.

У Менску ў перыяд ад **14 па 20** верасня адбудуцца сходы мастакоў, прысвечаныя становішчу паасобных участкаў выяўленчага мастацтва: жывапісу, скульптуры, графікі, афармленчай рабоце, а таксама становішчу мастацкай асветы ў БССР.

На ўсебеларускай канферэнцыі будзе арганізована выстаўка твораў, адлюстроўваючых творчы рост мастакоў і скульптараў БССР.

—о—

І. Н. АНТОНАЎ

Недарэчны выпадак вырваў з нашых радоў маладое жыццё артыста Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра — Івана Нікіціча Антонава.

Сярэдняга росту, светлавалосы з празрыстымі спакойнымі вачыма, ён надоўга застанецца ў нашай памяці, як вобраз скромнага, адданага справе, сапраўды таленавітага маладога майстра сцэны, стварыўшага рад яркіх мастацкіх вобразаў.

Прыбіты адвечным горам прыгонны селянін Каспар з п'есы «Салавей» З. Бядулі, Іезуіт-ксёндз з «Партызанаў» К. Крапівы, інжынер - канструктар Кочын з «Вочнай стаўкі» Л. Шэйніна і бр. Тур, Алесь з «Бацькаўшчыны» К. Чорнага — вось некаторыя з шматлікіх, выкананых за дзесяць год працы ў нашым тэатры, роляў.

Іван Нікіціч заўсёды вызначаўся добрым веданнем жыцця, выключнай наглядальнасцю, а адсюль—удумлівым падыходам да раскрыцця социяльнай сутнасці вобраза, да ўсебаковага паказу яго яркімі сцэнічнымі фарбамі.

Перад гэтым маладым совецкім актoрам была шырока раскрыта сапраўды прыгожая бліскучая будучыня. Яго сцэнічныя поспехі, яго шчасце былі абумоўлены перамогай соцыялістычнай рэволюцыі, якая падаравала яму сапраўдную радасць і вялікае творчае жыццё.

Мы назаўсёды запомнім дарагога нам усмешлівага, маладога і юнага — Івана Нікіціча Антонава.

Калектыў БДДТ.

Старонкі з гісторыі тэатра

С. Дурылін

Дзед і ўнук

(ПРОУ САДОУСКІ 1-ы і ПРОУ САДОУСКІ 2-гі).

У гэтым годзе мінула 66 гадоў з дня смерці Прова Міхайлавіча Садоўскага (1818—1872).

Ен быў заснавальнікам слаўнага тэатральнага роду Садоўскіх—у 1939 годзе спаўняецца сто гадоў, як гэты род, не пакідаючы падмосткаў Малога тэатра, безупынна служыць справе рэалізма і жыццёвай праўды на рускай сцэне.

Прадстаўнік гэтага роду—унук яго заснавальніка, які носіць яго імя,— Проў Міхайлавіч Садоўскі з'яўляецца ў нашыя дні адным з вядучых актораў совецкага тэатра. 24 верасня 1937 года ён, П. М. Садоўскі 2-гі, за выдатныя заслугі ў справе развіцця рускага тэатральнага мастацтва ўзнагароджаны ордэнам Леніна з наданнем звання народнага артыста СССР.

Гэтай ганаровай узнагародай, вышэйшай у нашай краіне, у асобе ўнука—узнагароджваецца ўвесь тэатральны род Садоўскіх, якія заўсёды стаялі за сувязь мастацтва з народам, заўсёды былі вернымі саюзнікамі Гогаля, Астроўскага, Льва Талстога ў справе стварэння рэалістычнага тэатра, вартага нашага вялікага народа.

Елецкі, мешчанін па паходжанню, бядняк па кішэні, вялікі артыст па прызванню, будучы Проў Садоўскі 1-шы, яшчэ дзевяцігадовым хлопчыкам ужо з захапленнем дыхаў паветрам куліс. Яго сапраўднае прозвішча было Ермілаў, але ён узяў сабе імя Садоўскі ад братоў сваёй маці, небезвядомых правінцыяльных актораў. Ен рос, вучыўся, дняваў і начаваў у тэатры. Ен пачаў з працы каля актора: дзевяцігадовы хлопчык, ён перапісваў ролі і атрымліваў за гэта рубель... за сезон! Затым ён вышаў на сцэну ў ролях дзяцей і падросткаў і не сходзіў з яе да смерці.

Садоўскі выпіў да кроплі ўсю горач жыцця правінцыяльнага актора ў так званы «добры стары час». Пасля прыгоннага селяніна, рабочага і салдата, актор быў самай бяспраўнай асобай у царскай Расіі. У яго была дрэнная рэпутацыя камедыянта, злодзея і невыправімага распусніка. Рэпутацыя гэта, якая падтрымлівалася царквой, была так моцна і паўсямесна, што ў «прыстойных дамах» акторам адмаўлялі ў кватэры, а калі актор паміраў, яго хавалі на асобным участку могільніка, далей ад іншых нябожчыкаў. Актор не меў пастаяннага заработку і ніхто не абараняў яго правы на працу. Акторы не мелі права іграць пад святы, не мелі права паказваць спектакляў пастом. У летні час тэатры бяздзейнічалі. Пры нязначнай колькасці гледачоў (народу тэатр быў недасягаемы, а купецтва, баючыся граха, у тэатр не хадзіла), актор павінен быў кожны дзень выступаць у новай п'есе. Гэтая катаржная праца ўзнагароджвалася мізэрнымі грашамі.

Аднойчы Садоўскаму і яго таварышам акторам давялося іграць перад **адзіным** гледачом у тэатры Гэта быў п'яны шынкар. Ен згадзіўся сытна накарміць актораў, якія гібелі ад голаду, калі яны сыграюць спектакль для яго аднаго. Акторы ігралі, а шынкар уголас бракаваў іх ігру і п'есу. Нарэшце, яму надакучыла глядзець драму. Ен узмахнуў рукою, каб спынілі ігру, і загадаў акторам пусціцца ў скокі.

Калі слухачы, якім Садоўскі расказаў гэты выпадак, не хацелі паверыць у яго вернасць, артыст сурова растлумачыў, што было і горш: у Ельцы адзін актор проста-напраста памёр ад голаду.

Сустрэўшыся з Астроўскім, Садоўскі расказаў яму многа горкіх апавяданняў пра лёс рускага актора,—і вялікі драматург адлюстраваў іх у сваіх п'есах з жыцця актораў («Лес», «Таленты і паклоннікі», «Без віны вінаватыя»).

Проў Садоўскі вынес на сваіх плячах цяжкую долю нешчаслівцаў—і да 20 гадоў склаўся ўжо ў яркага актора з бліскучымі здольнасцямі.

Яго заўважыў гастраліруючы ў правінцыі вялікі Шчэпкін і дамогся прыняцця Садоўскага ў маскоўскі Малы тэатр. Гэта было ў 1839 годзе.

Але прайшлі доўгія годы, пакуль дараванне Садоўскага знайшло сабе вартую ацэнку. Асноўнай рысай гэтага даравання было глыбокае пачуццё жыццёвай праўды, здзіўляючая прастата ў сцэнічным паказе жыццёвых з'яў і людскіх характараў. А на сцэне панавала ў гэтыя гады траскучая меладрама і пырхаў на падмостках легкадумны вадэвіль, якім не было ніякай справы да праўды і прастаты.

Але Садоўскі ўпарта ішоў сваім шляхам, і, калі сустрэўся з Гогалем, апошні патрабаваў для Осіпа ў «Рэвізоры», для Падкалесіна ў «Жаніцьбе» таго, чым быў багаты Садоўскі: цвярозага вывучэння рэчаіснасці, праўдзівага раскрыцця чалавечых характараў і грамадскіх тыпаў,—патрабаваў прастаты і праўды.

Але сапраўднай урачыстасцю П. Садоўскага было паяўленне (з 1853 года) на сцэне п'ес Астроўскага. У Астроўскім ён знайшоў другога сябе: так кроўна родны былі талент актора і талент драматурга. Астроўскі адчуў у Садоўскім магутнага саюзніка ў раскрыцці «цёмнага царства» старой Расіі. За выключэннем трох п'ес, Садоўскі іграў ва ўсіх п'есах Астроўскага і ў кожнай ствараў вобраз, быццам перанесены з жыцця на сцэну. Галерэя гэтых вобразаў Садоўскага незвычайна багата. Тут і вобразы з рускай гісторыі: злы ваявода-гвалтаўнік XVII стагоддзя («Ваявода»)—побач правадыр народнага апалчэння супроць палякаў-інтэрвентаў Мінін («Мінін»). Тут і вобразы купцоў-самадураў усіх тыпаў і ўсіх адценняў—ад хмурага Дзікога да недарэчнага «Кіт Кітыча». Тут і патрасаючы вобраз Любіма Тарцова («Беднасць не парок»), які «упаў верхнім канцом да ўніз» і адчуў на сабе ўсю горач і бяду тых, хто ўдаўлены «ўніз» жыцця кулацкімі ботамі Дзікіх і Курасляпаў.

«Садоўскі здзіўляў глыбокімі ведамі рускага жыцця. Але ён не быў халодным наглядальнікам яго цёмных кутkоў і калекцыянерам звярыных монстраў усялякага роду. Садоўскі быў актор-дэмакрат, які ненавідзіў усіх хто прыгнятаў працоўны рускі народ. Вось чаму яго галерэя вобразаў Астроўскага была грозным абвінавачваючым актам «цёмнаму царству» Дзікіх і Курасляпавых, і вось чаму з такой светлай верай у сілу рускага народа маляваў Садоўскі супрацьлеглыя вобразы— вобраз Мініна, герояў народнага вызвалення.

Проў Садоўскі памёр, перадаўшы свае творчыя заветы сыну і нявестцы: Міхаіл Провавіч (памёр у 1910 годзе) і Ольга Осіпаўна Садоўская (памёрла ў 1919 годзе) былі вартымі прадаўжальнікамі справы Садоўскага-бацькі. З той-жа замілаванай увагаю да рускага народнага жыцця, з тым-жа высокім майстэрствам, з той-жа прастатой і праўдай яны стварылі незабыўныя вобразы ў п'есах Грыбаедава, Пушкіна, Гогаля і Астроўскага.

Цяперашні прадстаўнік роду Садоўскіх — П. М. Садоўскі, які выступіў упершыню на сцэне ў 1895 годзе, з поспехам прадаўжае справу дзеда, бацькі і маці, Астроўскі і для яго з'яўляецца любімым драматургам, хаця яго амплуа — драматычны герой — іншае, чым амплуа яго дзеда і бацькі.

Да лепшых роляў Прова Садоўскага 2-га адносяцца: Мізгір («Снегурачка»), Дубровін («Ваявода»), Мілавідаў («На бойкім месцы»), Глумаў («На ўсякага мудраца досыць прастаты»). Апошнюю па часу ролю П. Садоўскага 2-га ў рэпертуары Астроўскага з'яўляецца Нешчаслівцаў у «Лесе», у якім яго дзед іграў купца Васьмібратава, а бацька—Шчасліўцава.

У Мізгіры—Садоўскага маладая страснасць палюбоўніка спалучалася з удальствам, якое ў рускіх народных песнях выстаўляецца лепшай уласцівасцю «добрага маладца».

Садоўскі з'яўляецца сапраўдным майстрам рускай мовы: мова Мізгіра, як і мова Дубравіна ў «Ваяводзе», можа служыць у выкананні Садоўскага ўзорам паэтычнай мовы; набытая словам музычнасць надае яму магутную дзейнасць. Але гэтая паэтычнасць і музычнасць мовы добра ўжываецца ў Садоўскага з прастатой і яркасцю.

Вобраз Дубровіна, які стаяў за народнае шчасце, упарта і смела змагаўся з самавольствам ваяводы,—абвеяны ў Садоўскага вольнымі ветрамі волжскіх прастораў. На твары яго Рамана Дубровіна ляжыць загар спякотнага сонца, неабсяжных стэпаў, калісь поўных славаю Сцяпана Разіна.

Дыстанцыя велізарнага памеру ад Мізгіра і Дубровіна да Мілавідава і Глумава. Аднак гэты цяжкі пераход Садоўскі робіць бліскуча.

Яго памешчык Мілавідаў, гуляка і прыгоннік-распуснік, бліскучы па вернасці гістарычных контураў ролі: ад гэтай постаці так і вее ўсімі «араматамі» памешчыцкай сядзібы, дзе цэлую сялянскую сям'ю праменьвалі на пародзістае шчанё, а на масленіцы каталіся на дзеўках, запрэжаных у розвальні.

У Глумаву—Садоўскага адчуваецца злы розум, эпіграматычная мова, багатая, прагнучая жыцця натура, якая разлічана маскіруе сябе ў мнімае ўбоства, верна скапіраванае з сапраўднага ўбоства разлагаючайся вакол яго арыстакратыі і бюракратыі. Але, ярка і ясна паказваючы адаронасць натуры Глумава, Садоўскі яшчэ ярчэй паказвае, што гэты «мудрэц» дваранскіх салонаў 1860-х гадоў з'яўляецца адным з гнюснейшых прадстаўнікоў подлага прыстасавання да самых дзікіх з натхніцеляў палітычнай рэакцыі. Вобраз Глумава паказаны ў Садоўскага такім, якім яго развіў Салтыкаў-Шчэдрын у сваёй сатыры, якая з'яўляецца нібы працягам камедыі Астроўскага.

У 1926 годзе П. М. Садоўскі сыграў сваю сапраўдную гістарычную ролю— камісара Кошкіна ў «Любові Яравой» К. Трэнева.

Садоўскаму ўдалося, ні на адзіную рысу не пакідаючы глебы рэчаіснасці, уліць у вобраз рэволюцыйнага камісара надзвычайны пафас палкага будаўніка новага грамадства.

П. М. Садоўскі знаходзіцца зараз ў росквіце сваіх творчых сіл, і совецкі глядач мае права чакаць ад яго яшчэ многа новых работ.

Шлях ад дзеда да ўнука—ад Прова Садоўскага 1-га да Прова Садоўскага 2-га—знамянуе амаль увесь шлях, пройдзены рускім акторам.

Гісторыя роду Садоўскіх коротка заключае ў сябе ўсю гісторыю рускага актора—яго жахлівае мінулае і яго выдатнае сучаснае.

Нам. адказнага рэдактара
А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрэс рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Б—5643.